## *РЭЦЭНЗІІ*

# КАЛІ І ЯК УЗНІКЛА БЕЛАРУСЬ?

У гісторыі Беларусі, бадай, няма больш складанага і заблытанага пытання, чым узнікненне Белай Русі, паходжанне яе народа. Праўда, на першы погляд, тут усё ў парадку. Савецкімі і замежнымі вучонымі напісаны сур'езныя навуковыя працы па дадзенай праблеме, выпрацаваны пэўныя канцэпцыі. Сярод іх кніга Я. Ф. Карскага «Беларусы», артыкул У. І. Пічэты «Утварэнне беларускага народа», манаграфія М. Я. Грынблата «Беларусы».

Але частка навуковых работ мае аднабокі і даволі спрэчны характар, некаторыя недастаткова аргументаваны. Многія факты старажытнай гісторыі замоўчваліся, каштоўныя першакрыніцы захоўваліся ў спецфондах і таму не былі даступныя беларускім вучоным.

На сучасным складаным этапе гісторыі Беларусі, калі вызначаецца напрамак яе будучага развіцця і стаіць задача адраджэння нацыянальнай культуры, узрастае цікавасць да вытокаў беларускага народа.

Кніга М. Ф. Піліпенкі «Узнікненне Беларусі»* якраз і дае адказ на некаторыя пытанні. Аўтар кнігі — гісторык-этнограф даследуе гэту праблему больш за 15 гадоў. Ён усебакова вывучыў айчынныя і замежныя публікацыі на англійскай, нямецкай і польскай мовах. Здзіўляюць колькасць і характар першакрыніц, якія выкарыстаў М. Ф. Піліпенка. Гэта і старажытныя летапісы, даныя археалогіі, мовазнаўства, усходнеславянскай этнаграфіі і фалькларыстыкі, антрапалогіі, эканамічнай і палітычнай гісторыі ў сярэдневяковую эпоху.

Чым жа канкрэтна адрозніваецца манаграфія «Узнікненне Беларусі» ад усёй папярэдняй літаратуры па гэтым пытанні? Па-першае, комплексным падыходам да праблемы, новым спосабам даследавання. М. Ф. Піліпенка адмовіўся ад уяўлення аб беларускім этнагенезе як спрошчанай эвалюцыі, а таксама ад тлумачэння яго толькі вялікай міграцыяй. У сваіх даследаваннях ён улічвае ролю многіх фактараў — эканамічнага, палітычнага, гістарычнага і звяртае асаблівую ўвагу на ролю дыфузіі ў этнічных працэсах, перагрупоўку кампанентаў культуры і мовы.

Па-другое, у рэцэнзуемай працы аргументуецца палажэнне аб змешаным (славянабалцкім) паходжанні дрыгавічоў, крывічоў, радзімічаў і высокім узроўні іх развіцця. Гэтыя супольнасці характарызуюцца не як «саюзы плямёнаў», а як протанароднасці. Упершыню паказана, як фарміравалася агульнаўсходнеславянская этнічная тэрыторыя «Русь», да якой, на думку вучонага, некалькі стагоддзяў адносіўся і наш край.

Па-трэцяе, тлумачачы асноўную прычыну ўзнікнення Беларусі, М. Ф. Піліпенка пановаму ацэньвае ролю розных неўсходнеславянскіх этнічных груп у фарміраванні беларускага народа — заходнеславянскай (польскай), указваючы на ўдзел у беларускім этнагенезе не толькі ўсходніх (літваў, латыгодаў), але і заходніх балтаў (прусаў, жэмайтаў, яцвягаў), а таксама цюрскай групы (татар). На наш погляд, арыгінальна тлумачыцца паходжанне і значэнне такіх назваў, як «Белая Русь», «Чорная Русь», «Літва», «Палессе». Вучоны прыходзіць да вываду, што працэс утварэння Беларусі, беларускага народа быў значна больш складаны, чым уяўлялася да цяперашняга часу.

Галоўная вартасць манаграфіі М. Ф. Піліпенкі не толькі ў тым, што ў ёй разгледжаны розныя пункты погляду савецкіх і замежных вучоных аб паходжанні беларусаў, а галоўным чынам у тым, што прапануецца новая, аўтарская канцэпцыя ўзнікнення Беларусі, беларусаў.

На думку вучонага, этнічная гісторыя насельніцтва на тэрыторыі сучаснай Беларусі бярэ свой пачатак з эпохі старажытнакаменнага веку, з часу засялення тэрыторыі Беларусі чалавекам — звыш сарака тысяч гадоў таму назад. Этнічны склад насельніцтва па гэтай тэрыторыі поўнасцю змяніўся ў эпоху ранняга металу (канец III тысячагоддзя да н. э.— IV—V стст. н. э.). М. Ф. Піліпенка адзначае, што наступны перыяд у этнічнай гісторыі насельніцтва на тэрыторыі Беларусі пачаўся ў раннім сярэдневякоўі. Новы этап у этнічнай гісторыі насельніцтва на гэтай тэрыторыі звязаны, з пункту погляду вучонага, з кансалідацыяй першапачатковых усходнеславянскіх этнічных супольнасцей — дрыгавічоў, радзімічаў, крывічоў і іншых у агульнаўсходнеславянскую старажытнарускую этнічную супольнасць.

Вучоны лічыць, што этнічная тэрыторыя сучаснай Беларусі сфарміравалася ў выніку кансалідацыі былой паўднёвай часткі «палескага» субэтнасу агульнаўсходнеславян-

* Пилипенко М. Ф. Возникновение Белоруссии. Новая концепция. Минск: Беларусь. 1991. 143 с.

ўскай старажытнарускай этнічнай супольнасці і паўднёвай часткі «беларускага» (падзвінска-дняпроўскага) субэтнасу агульнаўсходнеславянскай старажытнарускай этнічнай супольнасці. Гэтыя часткі ўсходнеславянскага насельніцтва склалі аснову беларускага этнасу. На падставе глыбокага аналізу шматлікіх крыніц М. Ф. Піліпенка прыйшоў да высновы, што тэрмін «Белая Русь» («Беларусь») набыў сучаснае этнічнае значэнне ў познім сярэдневякоўі, а менавіта ў XV—XVI стст.

На наш погляд, з заключных вывадаў вучонага асаблівую значнасць мае палажэнне аб трох найбольш важных прычынах узнікнення Беларусі. Адной з іх было змяненне гістарычных умоў развіцця Папрыпяцця, Панямоння, Падзвіння і Падняпроўя ў познім сярэдневякоўі, а менавіта агрэсія нямецкіх крыжаносцаў з захаду і татар з усходу, працяглая сумесная барацьба насельніцтва гэтага краю супраць захопнікаў за свабоду і незалежнасць. Другой прычынай узнікнення Беларусі, беларусаў з'явілася змяненне эканамічных сувязей гэтых зямель, больш хуткае эканамічнае развіццё ў гэты перыяд Панямоння, Міншчыны, Магілёўшчыны, устанаўленне больш цесных сувязей з гэтым рэгіёнам папрыпяцкіх і падзвінскіх зямель. Трэцяй прычынай фарміравання Беларусі, беларусаў стала змяненне палітычных умоў развіцця папрыпяцкіх, панёманскіх, падзвінскіх і падняпроўскіх зямель, узнікненне буйной дзяржавы — Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага, знаходжанне ўказаных зямель (асабліва Панямоння, Міншчыны, Магілёўшчыны) у цэнтры гэтай дзяржавы, якая згуртавала іх і палітычна.

Манаграфія М. Ф. Піліпенкі — значная з'ява, новае слова ў беларускай гістарычнай навуцы. Што датычыцца заўваг, то, на жаль, у рэцэнзуемай манаграфіі адсутнічаюць карты, схемы і табліцы, якія б дапамаглі гісторыкам, этнографам, мовазнаўцам, археолагам больш глыбока зразумець сутнасць новай канцэпцыі ўзнікнення Беларусі, якую прадстаўляе вучоны.

Сярод шматлікіх крыніц, выкарыстаных аўтарам, нават не ўпамінаюцца працы В. Ю. Ластоўскага, У. М. Ігнатоўскага, даследаванні У. Пічэты, манаграфія Я. І. Карнейчыка «Беларуская нацыя» (1969), у якіх закранаюцца розныя пытанні праблемы ўзнікнення Беларусі. Хоць апошнюю кнігу некаторыя вучоныя лічаць антынавуковай, трэба аргументаваць гэту антынавуковасць.

Гэтыя заўвагі носяць прыватны характар і ні ў якім разе не зніжаюць навуковую каштоўнасць манаграфіі М. Ф. Піліпенкі, якая ўносіць значны ўклад у савецкую гістарычную навуку.

*Э. Р. ІОФЭ*

## ПРАДМЕТ ВЫВУЧЭННЯ — БЕЛАРУСКАЯ ВЁСКА

Гісторыі беларускай вёскі ў эпоху феадалізму прысвечаны шматлікія даследаванні вучоных нашай краіны і Рэспублікі Польшча. Аналізу гэтых даследаванняў прысвечана і манаграфія Э. Р. Іофэ *. Аўтар больш вядомы як даследчык савецкай гістарыяграфіі Беларусі эпохі феадалізму. Яго пяру належаць працы пра К. І. Кернажыцкага, Ф. І. Забэлу, В. Д. Друшчыца, М. М. Улашчыка і іншых беларускіх савецкіх гісторыкаў. Новая манаграфія Э. Р. Іофэ падводзіць вынік яго шматгадовых даследаванняў савецкай гістарыяграфіі сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускай вёскі сярэдзіны XVII — першай палавіны XIX ст.

Рэцэнзуемая кніга з'яўляецца першым комплексным даследаваннем савецкай гістарыяграфіі сацыяльна-эканамічнага развіцця беларускай вёскі ў сярэдзіне XVII — першай палавіне XIX ст. Пры яе напісанні аўтар выкарыстаў манаграфіі, кнігі, брашуры, артыкулы, агульныя аглядныя працы, зборнікі дакументаў, кандыдацкія і доктарскія дысертацыі, аўтарэфераты дысертацый, матэрыялы дыскусій і сімпозіумаў, рэцэнзіі, бібліяграфічныя паказальнікі, матэрыялы архіваў АН СССР і АН БССР, Цэнтральнага дзяржаўнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва БССР, партыйнага архіва Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ і інш.

Аналізуючы савецкую гістарыяграфію 1917—1945 гг., Э. Р. Іофэ акцэнтуе ўвагу на даследаванні такіх пытанняў, як саслоўе — клас феадалаў і феадальная гаспадарка, сяляне і сялянская гаспадарка, вывучэнне гісторыі класавай барацьбы.

Ён адзначае, што пачынаючы з 20-х гадоў праблема класавай барацьбы сялянства ў Беларусі разглядаемага перыяду становіцца прадметам спецыяльнага вывучэння. Нягледзячы на істотныя недахопы, пэўны ўклад у вывучэнне гэтай праблемы ўнеслі працы В. К. Шчарбакова, І. Ф. Лочмеля, У. І. Пічэты, К. І. Кернажыцкага, М. В. Мялешкі, І. І. Ігнатовіч, А. А. Шлюбскага. Так, У. І. Пічэта паставіў пытанне аб прычынах сялянскіх хваляванняў у Беларусі ў эпоху феадалізму і тлумачыў іх пагоршаннем эканамічнага становішча сялянства, узмацненнем прыгоннага права. Менавіта ён зрабіў спробу раскрыць характар і формы сялянскіх хваляванняў, ролю дзяржавы ў падаўленні сялянскіх выступленняў, прычыны іх паражэння. Першым з савецкіх гісторыкаў У. І. Пічэта прывёў факты класавай барацьбы сялянства Беларусі ў першай палавіне XIX ст.

Адной з вартасцей рэцэнзуемай кнігі з'яўляецца належная ацэнка творчай спадчы-

* И о ф ф е Э. Г. Из истории белорусской деревни. Советская историография социально-экономического развития белорусской деревни середины XVII — первой половины XIX в. Минск: Ураджай, 1990.